**Гэта цікава!**

*З даўніх часоў чалавек намагаўся прыдумаць, як адсочваць час. Дзеля гэтага ён назіраў за Сонцам, Месяцам, зоркамі. А таксама ствараў адмысловыя прылады – гадзіннікі.*

*Першыя гадзіннікі проста адмяралі адрэзак (адцінак) часу, за які адбывалася пэўнае дзеянне. Напрыклад, пясок перасыпаўся з адной чашы ў іншую. Такі гадзіннік называўся* ***гнамон****.*

*Альбо адрэзак часу, за які вада з вялікай ёмістасці перацячэ ў спецыяльную міску. Вадзяны гадзіннік мае назву* ***клепсідра****. Ён быў больш дасканалым. На вялікую ёмістасць наносілі рыскі, па якіх вызначалі, які зараз час. Больш за тое, старажытныя кітайцы стварылі нават клепсідру-будзільнік. Яны прымацоўвалі пад сцёк вады сцябло бамбуку на рухомым мацаванні. Калі сцябло запаўнялася вадой, яно перакульвалася з гучным “плюх”, і ўсе навокал чулі, што прайшоў пэўны час.*

*Існаваў і агнявы гадзіннік. Тут адцінкі часу вымяраліся часам выгарання алею ці згарання свячы. Так і казалі: “Зараз 2 свячы”.*

*гнамон*



*клепсідра*



*агнявы гадзіннік*



**Заданні для самых кемлівых**

I) Колькі часу паказвае гадзіннік?



__________ гадзін

__________ хвілін

__________ секунд

II) Напішы свой расклад дня: што ты робіш у які час:

**Прыклад**

| | |
|---|---|
| Прачынаюся, умываюся | 7.00 – 7.20 |
| Снедаю | 7.20 – 7.40 |
| Займаюся ў школе | 8.00 – 12.30 |
| Абедаю | 13.00 – 14.00 |
| Гуляю на вуліцы | 14.00 – 15.00 |
| Выконваю хатнія заданні | 15.00 – 16.30 |
| Чытаю кнігі / гляджу мультфільмы / гуляю з цацкамі | 16.30 – 18.00 |
| Дапамагаю ў хатніх справах | 18.00 – 19.30 |
| Вячэраю | 19.30 – 20.30 |
| Мыюся, чышчу зубы | 20.30 – 21.00 |
| Кладуся спаць | 21.00 |

**МОЙ РАСКЛАД**

| | |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

III) Якой стрэлкі не хапае на малюнку? Дамалюй яе, дапішы прапушчаныя лічбы, размалюй карцінку.

